ция производства, использование многообразных форм интеграции и кооперации производства, развитие фермерского предпринимательства.

Характеризуя нормативную и позитивную роль государства в регулировании системы АПК, В.Л. Клюня отмечает, что она неизмеримо возрастает в условиях глобализации и регионализации мирового развития, действия агропродовольственных транснациональных корпораций, имеющихся слабостей и недостатков в традиционном рыночном механизме. Вследствие этого государственное регулирование развития АПК, являясь составной частью структуры рынка с преимущественно экономическими методами, заключается в формировании действенного инвестиционного механизма, стимулировании накопления агропромышленного капитала, создании новой системы и конкурентной среды на рынке кредитования АПК, сбалансированности ценового механизма, образовании целостной, универсальной, осуществляемой по единой схеме во всех отраслях экономики налоговой системы.

Разумеется, не все аспекты развития АПК Республики Беларусь в условиях переходной экономики рассмотрены одинаково глубоко. В целом монография представляет переосмысление многих теоретических представлений, методологических подходов к совокупности экономических проблем развития теперь самостоятельного народнохозяйственного АПК в условиях социально-экономической трансформации. Указанное фундаментальное исследование может быть полезно ученым-экономистам, преподавателям, аспирантам и студентам, руководителям и специалистам системы АПК, а также читателям, интересующимся проблемами АПК в условиях переходной экономики.

***И.В. Новикова***

М.Э. Часноускі. **Сістэмныя пераутварэнні у Рэспубліцы Польшча (1989–1999).** Мн.: БДУ, 2000. 288 с.

Разглядаемая манаграфія з'яуляецца па сутнасці першым выданнем у беларускай гістарыяграфіі, дзе у хранапагічным і праблемным аспектах даследаваны перадумовы, ход і вынікі сістэмных пераутварэнняу у Рэспубліцы Польшча у вызначаны перыяд. Абапіраючыся пераважна на матэрыялы польскіх даследчыкау, перыядычнага друку, дакументы бягучага архіва Міністэрства замежных спрау Рэспублікі Беларусь, уласныя назіранні, аутар здолеу даць поунае і дакладнае адлюстраванне аналізуемых падзей, зрабіць арыгінальныя высновы і абагульненні.

У кнізе падкрэслена, што Польшча у 1989 г. першай сярод краін сацыялістычнага блока уступіла на шлях мадэрнізацыі, што было звязана з маштабным крызісам, які ахапіу палітычную і сацыяльна-эканамічную сферы. У стварыушайся сітуацыі адзіным выйсцем для краіны стала дасягненне кампрамісу паміж рэфарматарскім крылом ПАРП і памяркоунай часткай апазіцыі, што было рэалізавана у ініцыятыве "Круглага стала". Дзякуючы гэтаму змянілася Канстытуцыя, былі уведзены пасада Прэзідэнта і Сенат у якасці вышэйшай палаты парламента, а з канца 1989 г. дадзены старт сістэмным пераутварэнням, якія прывялі да пераразмеркавання дзяржаунай улады сярод палітычных эліт Рэспублікі Польшча.

Даследчык справядліва адзначае, што разгортванне сістэмнай трансфармацыі, якое прыпадала на перыяд з 1990 па верасень 1993 г., было у першую чаргу непарыуна звязана з фарміраваннем асноу дэмакратычнага грамадства. Упор зроблены на стварэнне прававой дзяржавы, парламенцкай дэмакратыі, шматпартыйнай сістэмы, канчатковае адхіленне былой наменклатуры ад улады. У выніку 17 кастрычніка 1992 г. зацверджана так званая "Малая Канстытуцыя", якая стала актам грамадзянскай згоды і асновай новага ладу. Паралельна у краіне праходзілі эканамічныя пераутварэнні па метаду "шокавай тэрапіі" Л. Бальцэровіча. Заснаваныя на лібералізацыі цэн і стварэнні рынкавых інстытутау, макраэканамічнай стабілізацыі, яны на другім этапе рэформы выклікалі напружанасць у грамадстве, паставілі большасць насельніцтва на мяжу жабрацтва.

Можна пагадзіцца з аутарскай udsновай аб цяжкасцях другога этапа структурнай трансфармацыі, якія забяспечылі перамогу левых сіл на парламенцкіх выбарах 1993 г., а затым прывялі іх прадстауніка сацыял-дэмакрата Л. Квасьнеускага на пасаду прэзідэнта. Былі унесены карэктывы у эканамічную і сацыяльную палітыку, згладжаны негатыуныя наступствы "шокавай тэрапіі", што дазволіла на трэцім этапе структурнай трансфармацыі зменшыць беспрацоу'е і утрымаць тэмпы эканамічнага развіцця без змены курсу на лібералізацыю. Аднак і левыя не змаглі дасягнуць гарманічнага развіцця і цалкам справіцца з сацыяльнымі праблемамі.

У манаграфіі падрабязна аналізуецца чацвёрты этап сістэмнай трансфармацыі, які, на думку аутара, храналагічна прыпадае на 1997–1999 гг. Нам падаецца, што такі падыход трэба лічыць умоуным, бо нават сёння нельга сцвярджаць, што у Польшчы поунасцю адбылася постсацыялістычная мадэрнізацыя. Але варта адзначыць, што даследчык мае рацыю, калі падкрэслівае значэнне парламенцкіх выбарау 1997 г., якія прывялі да улады правых – Выбарчую акцыю "Салідарнасці" і Унію свабоды. Яны забяспечылі далейшае ажыццяуленне праграмы рэформ і прывялі польскае грамадства да капіталізму.

Асобнае месца у кнізе надаецца знешняй палітыцы дзяржавы. Аўтар не толькі адзначае радыкальныя змены у знешнепалітычнай дактрыне, але і характарызуе яе рэалізацыю. На падставе даволі багатага фактычнага матэрыялу аналізуюцца канкрэтныя намаганні краіны па уступленню у НАТА, іншыя структуры еурапейскай інтэграцыі, раскрываюцца здабыткі і пралікі у правядзенні рэгіянальнай палітыкі, у тым ліку і у адносінах з Рэспублікай Беларусь.

Манаграфію можна лічыць сапраўднай творчай удачай аутара. Яна будзе карыснай навукоуцам, студэнтам, шырокаму колу чытачоу, усім, хто цікавіцца праблемамі сучаснай гісторыі.

***Ю.Л. Казакоу***



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm